УДК 82.091

# ЛІТАРАТУРНЫ МАРШРУТ "МАЛЕНСТВА СЦЕЖКІ ЗАЛАТЫЯ" НА АСНОВЕ ПАЭМЫ ЯКУБА КОЛАСА "НОВАЯ ЗЯМЛЯ"

*Шапялевіч З.В.*

*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі”*
*Філіял “Мінскі радыётэхнічны каледж”, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік: Дакучыц В. Р. – выкладчык вышэйшай катэгорыі*
*дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла*

**Анатацыя.** Гісторыя напісання і аналіз паэмы Якуба Коласа “Новая Зямля”. Складанне літаратурнага маршруту "Маленства сцежкі залатыя" на аснове паэмы Я. Коласа.

**Ключавыя словы:** Я. Колас, паэма “Новая Зямля”, маршрут.

***Уступ***. Якуб Колас – класік беларускай літаратуры. Ён стварыў самабытныя вобразы, узняў праблемы агульнанароднага значэння. Паэмы «Сымон-музыка», «Новая зямля», «Рыбакова хата», «Адплата», аповесці «Дрыгва» і «На прасторах жыцця», трылогія «На ростанях» сталі любімымі творамі розных пакаленняў чытачоў. Творы перакладзены на мовы розных народаў свету. У гэтым годзе адзначаецца юбілей – 140 гадоў з дня нараджэння песняра. Творчасць Якуба Коласа даследавана і даследуецца многімі літаратурнымі крытыкамі: Ж. Шаладонавай, Е. Андрэевай, І. Навуменка, В. Івашыным, В. Максімовічам. У нашай працы мы яшчэ раз звернемся да паэмы Якуба Коласа “Новая Зямля” і паспрабуем паглядзець вачамі класіка на дарагія яго сэрцу мясціны, а таксама распрацаваць на аснове паэмы літаратурны маршрут "Маленства сцежкі залатыя".

***Асноўная частка***. "Новая зямля" – шэдэўр беларускай літаратуры, энцыклапедыя сялянскага жыцця. Якуб Колас пачаў пісаць паэму ў 1908 г. у Мінскім астрозе, калі знаходзіўся ў зняволенні за ўдзел у настаўніцкім з’ездзе. У астрозе Якуб Колас стварыў вершаваныя апавяданні пра жыццё сваёй сям’і ў канцы XIX стагоддзя. Напачатку аўтарам у васьмі вершаваных апавяданнях былі занатаваны самыя яркія ўражанні маленства. У зняволенні паэт быў вымушаны даставаць з памяці даўно забытае, але такое роднае. Ён прыгадваў мясціны дзяцінства, любыя сэрцу палі, лясы, лугі, поўныя кветак, – усё тое, сярод чаго ён рос, што яго хваляваля і захапляла. Родныя краявіды ажывалі на старонках твораў. Паступова ў Якуба Коласа з’явілася задума вялікага твора, прысвечанага найперш бацьку – лесніку на службе ў князёў Радзівілаў, – які ўсё жыццё марыў пра свабоду. Свабода для чалавека, які вымушаны служыць, каб карміць сям’ю, заключалася ва ўласнай маёмасці, у дадзеным выпадку – зямлі. Паэма «Новая зямля» задумвалася як твор пра вольную працу на сваёй зямлі. У савецкі час пісьменнік зноў вярнуўся да паэмы: у 1919–1923 гадах напісаў яшчэ 19 раздзелаў і перапрацаваў некаторыя, створаныя ў турме. Так на свет з’явіўся адзін з лепшых і глыбокіх твораў пісьменніка.

Энцыклапедыя беларускага сялянскага жыцця, паэма «Новая зямля» Якуба Коласа аўтабіяграфічная, дакладная ў дэталях. Аўтар апісаў жыццё сваёй сям'і на хутары Альбуць (рысунак 1), змяніўшы толькі назву на Парэчча. Сёння там знаходзіцца філіял музея Якуба Коласа, а экспазіцыя прысвечана, зразумела, «Новай зямлі». На прасторнай сядзібе, агароджанай парканам, – вялікі хлеў, гумно, побач з ім павець з гаспадарчымі прыладамі, каля яе расце груша-дзічка. Вось як сам аўтар апісвае гэтыя мясціны:

*Парэчча – слаўная мясціна,*
*Куток прыгожы і вясёлы:*
*Як мора – лес, як неба – долы,*
*Зіхціць у кветках лугавіна...*
*А колькі ягад і парэчак!*

*Як пахне мёдам поле грэчак,*
*Калі пачнуць яны цвісці!*



Рысунак 1 – Хутар Альбуць

Сяло Акінчыцы (рысунак 2) – не проста адна з вех на жыццёвым і творчым шляху песняра беларускай літаратуры Якуба Коласа. Гэта – яго калыска, тая самая маленькая радзіма, якая і падарыла нам будучага класіка ў далёкім 1882 годзе. Няхай яго сям'я і пражыла тут усяго чатыры месяцы, і няхай вёскі ўжо няма, – яна стала ўскраінай горада Стоўбцы, – але памяць пра гэту гістарычную падзею жыве і зараз.



Рысунак 2 – Сяло Акінчыцы

Ласток, або Сухошчына, (рысунак 3) – трэцяе месца жыхарства бацькоў Якуба Коласа. Сюды Міхаіл Міцкевіч перабраўся з Мікалаеўскай лясной каморы і жыў да 1890 года. Ласток размешчаны за 10 км ад Мікалаеўшчыны, за 4 км ад вёскі Сверынава, былога шляхецкага засценка. Сядзіба (леснікова пасада) акружана яловым лесам.

У Ластку раней стаяла дзве хаты: у новай жыла сям’я бацькі Якуба Коласа, у старой мясціліся рабочыя, якія выраблялі гонту. Хата і гумно захаваліся да нашых дзён. Яны – сведкі жыцця сям’і Міцкевічаў у гэтым благаслаўлёным куточку. У “Новай Зямлі” вось так аўтар кажа пра гэтую сялібу:

*Яму ўважыў пан ляснічы,*
*І сеў Міхал у страшнай дзічы,*
*Дзе лес адзін, хмызняк ды поле*
*Ды ветру посвісты на волі.*
…
*У тым кутку, глухім і дзікім,*
*Стараннем дзядзькавым вялікім*
*І цяжкай працай хлебароба*

*Набыта розная надоба;*
*Ўсё зацвіло, загаманіла,*
*Бы жыватворная тут сіла*
*Ад сну прыроду абудзіла.*



Рысунак 3 – Хутар Ласток

У 1910 годзе, праз восем гадоў пасля смерці Міхала, Міцкевічы нарэшце набылі сваю хату ў Смольні (рысунак 4). У ёй жылі маці Ганна Юр’еўна, дзядзька Антось, сёстры паэта Міхаліна, Алена, Марыя, браты Уладзя, Міхась і Іосіф.

Якуб Колас у паэме “Новая Зямля” так звяртаецца да сваіх любімых мясцін:

*Малюнкі родныя і з’явы!*
*Як вы мне любы, як цікавы!*
*Як часта мілай чарадою*
*Вы ўстаяце перада мною!*

Калі будавалася хата ў Смольні, Якуб Колас сядзеў у мінскай турме і толькі 19 верасня 1911 года прыехаў сюды ўпершыню. Беднай і запусцелай здалася паэту Смольня. Каб хоць крыху зрабіць яе ўтульнай, Якуб Колас пасадзіў на сядзібе дрэвы. Ліпы, пасаджаныя ў яго першы прыезд, растуць і сёння. Пад гэтымі дрэвамі сядзелі маладыя Якуб Колас і Янка Купала ў час першай сустрэчы летам 1912 года.



Рысунак 4 – Хата ў Смольні

***Заключэнне***. Заўсёды ёсць і будуць людзі, аматары роднай мовы і патрыёты роднага краю, якія захапляюцца творчасцю Коласа, цікавяцца яго біяграфіяй. І ім будзе цікава наведаць тыя мясціны, дзе нарадзіўся, жыў і натхняўся роднымі краявідамі іх любімы паэт. Ваколіцы Альбуцi, Акінчыц, Ластка і Смольні – невычэрпныя крыніцы творчасці нашага класіка.

Спадзяемся, што наша праца стане цікавай ўсім, хто захапляецца творчасцю Якуба Коласа, што гэты маршрут стане карысным не толькі для беларускіх турыстаў, але і для замежных, якіх вабіць прыгажосцю наш беларускі край і нашы славутыя землякі.

На аснове аналізу паэмы Я.Коласа “Новая Зямля” для ўсіх аматараў, хто цікавіцца жыццём і творчасцю Якуба Коласа, любіць чытаць яго творы, мы распрацавалі літаратурны маршрут "Маленства сцежкі залатыя" (рысунак 5).




Рысунак 5 – Літаратурны маршрут "Маленства сцежкі залатыя".

## *Спіс літаратуры*


*1. Александровіч, С. Х. Ад роднае зямлі: Аповесць пра маленства і юнацтва Я. Коласа / С. Х. Александровіч. — Мінск: Дзяржвыд БССР, 1962. — 236 с.*

*2. Александровіч, С. Х. На шырокі прастор: Старонкі жыцця Якуба Коласа / С. Х. Александровіч. — Мінск: Мастацкая літаратура, 1972. — 429 с.*

*3. Пшыркоў, Ю. С. Эпас рэвалюцыі: паэмы Я. Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях» / Ю. С. Пшыркоў. — Мінск: Вышэйшая школа, 1975. — 238 с.*

*4. Генадзь Тумас. Родны бераг песняра. — Мінск: «Полымя», 1982. — 30 с. — 3 000 экз. экз.*

*5. Акінчыцы // Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. — Tom VII (Netrebka — Perepiat), 1886. — S. 423 (польск.)*

*6. Казбярук, У. М. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» : у святле славянскіх традыцый / У. М. Казбярук; рэд. І. Я. Навуменка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1979. — 112 с.*

*7. Колас Я. Новая зямля / Пад агульн. рэд. Я. Янушкевіча. -- Мінск: Беларускі фонд культуры, 2002. -- 900 с.*


UDC 82.091

# LITERARY ROUTE "INFANCY OF THE GOLDEN PATHS" BASED ON THE POEM "NOVAYA ZEMLYA" BY YAKUB KOLAS

*Shepelevich Z. V.*

*Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics,*
*affiliate Minsk Radioengineering College, Minsk, Republic of Belarus*

*Dakuchyts V. R. teacher of the highest qualification category*
*of disciplines in Social and Humanitarian disciplines*

**Abstract.** Analysis of Yakub Kolas' poem ”Novaya Zemlya". Drawing up the route "infancy of the golden paths", based on this poem.

**Keywords**: route, Y. Kolas, poem “Novaya Zemlya".